зграбнасці, стройнасці, выцягнутасці, палётнасці формы, ажыўляюць гульню святлаценю. У архітэктуры Беларусі канелюраваныя калоны (паўкалоны, пілястры) ужываліся пераважна ў аздабленні культавых, грамадскіх і жылых пабудоў барока (інтэр'ер касцёла Божага Цела ў Нясвіжы), класіцызму (*Жамыслаўская сядзіба*), ампіру (будынак Нац. банка Рэспублікі Беларусь у Мінску).

*Ю.Ю.Захарына.*

**КАНЕЛЮ́РЫ** (ад франц. cannelure жалабок), падоўжаныя жалабкі ў ствале калоны (паўкалоны, пілястры) і гарызантальныя жалабкі тарусаў (паўвалоў ці валоў) базы іанічнага, зрэдку карынфскага ордараў. У межах антычнага ордара колькасць К. у ствале калоны звычайна роўная 20. У аздабленні калон выкарыстоўваюцца з мэтай узмацнення эфекту



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ